# Ф.К.Багушэвіч: агульныя звесткі

**Пастановай Савета Міністраў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ад 4 студзеня 1962 года №4 Жупранскай сярэдняй школе было прысвоена імя Францішка Казіміравіча Багушэвіча. Падпіслі пастанову старшыня Савета Міністраў БССР Ц.Кісялёў і ўпраўляючы спаравамі Савета Міністраў І. Казлоў.**

Жыццёвы шлях Ф. К. Багушэвіча цесна звязаны з Жупранамі. Ён з сям'ёй часта бываў у Жупранах на кірмашах, якія ладзіліся на рыначнай плошчы, у мясцовым касцёле Пятра і Паўла на фэстах. Паэт любіў сустракацца з мясцовымі жыхарамі, чытаў ім свае вершы. Калі пачалося будаўніцтва касцёла, спачатку бацька, а пасля і сам Францішак Багушэвіч давалі грошы на будаўніцтва святыні.

Нарадзіўся Францішак Багушэвіч 9 (21) сакавіка 1840 года ў фальварку Свіраны ў незаможнай шляхецкай сям`і. Тут ён упершыню пачуе самотную песню пастуховай жалейкі, пабачыць цяжкую паднявольную працу селяніна-гаротніка. Са Свіранаў пабягуць у вялікі свет і яго першыя шляхі-дарогі.

У 1846 годзе сям'я Казіміра Багушэвіча пераехала ў бацькоўскі фальварак Кушляны Ашмянскага павета. У Кушлянах (другая назва Мігуцяны) прайшлі дзіцячыя і юнацкія гады Францішка Багушэвіча. Удзельнакімі яго гульняў былі браты Уладзіслаў, Валяр'ян, Апалінар, сястра Ганна, дзеці з навакольных засценкаў і вёсак.

Вучыўся Францішак спачатку дома ў так званых дарэктараў – хатніх настаўнікаў. Восенню 1852 года разам з малодшым братам Валяр'янам паступіў у Віленскую гімназію, якую скончыў у 1861 годзе.

Шмат увагі ў гімназіі надавалі вывучэнню моў. Францішак, напрыклад, вывучаў рускую, польскую, славянскую, а таксама нямецкую, французскую, латынь. Для наглядных дапаможнікаў у гімназіі скарыстоўвалі багатыя

калекцыі, сабраныя яшчэ ўніверсітэтам. Навучэнне было платнае. Гімназісты хадзілі ў форменным адзенні.

Багушэвіч вучыўся ў гімназіі няроўна, але скончыў яе ў ліку чатырох лепшых выпускнікоў года.

Цэлае лета 1861 года Францішак Багушэвіч збіраў і афармляў дакументы для залічэння яго ў Пецярбургскі імператарскі ўніверсітэт. У верасні 1861 года Ф. Багушэвіч стаў студэнтам фізіка-матэматычнага факультэта Пецярбургскага ўніверсітэта. У неспакойны час распачалася Францішкава вучоба. Студэнты не хацелі прымаць так званыя матрыкулы (заліковыя кніжкі) з новымі правіламі, што абмяжоўвалі іх грамадзянскія правы. Ва ўніверсітэце замест заняткаў пачаліся сходы, мітынгі, маніфестацыі, а з імі арышты…

Не прыняў матрыкулы і Багушэвіч. З гэтай прычыны ў канцы лістапада ён вымушаны пакінуць універсітэт (нібыта з-за хваробы).

На пачатку 60-х гадоў Ф. Багушэвіч працаваў у прыватнай Доцішкаўскай школе Лідскага павета, якую за свій кошт утрымліваў гаспадар маёнтка Аляксандр Звяровіч (у мясцовым вымаўленні – Жвіровіч).

Пасля лёс закінуў Багушэвіча на Украіну. Там ён паступіў на вучобу ў Нежынскі юрыдычны ліцэй.

У ліпені 1868 года Ф. Багушэвіч закончыў навучанне ў Нежынскім юрыдычным ліцэі. 18 снежня 1868 года ён паступіў на службу памочнікам справавода Чарнігаўскага губернскага праўлення, а праз год перайшоў на пасаду следчага ў Чарнігаўскую палату крымінальнага і грамадзянскага суда. Пачаліся бясконцыя пераезды з аднаго месца на другое.

15 верасня 1874 года Францішак Багушэвіч бярэ шлюб з Габрыеляй Шклёнік, якая была родам з Мінска. Вянчанне адбылося ў сяле Баркоўка пад Нежынам. Габрыеля Міхайлаўна была адукаванай жанчынай, валодала замежнымі мовамі. Як прыгадваюць землякі-кушлянцы, з сялянамі размаўлялі па-беларуску.

20 лістапада 1883 года былі адкрыты новыя суды ў Вільні. З’явіліся вакантныя пасады для юрыстаў. Даведаўшыся пра гэта, Багушэвіч вырашыў пакінуць службу на Украіне і вярнуцца на Радзіму, стаць адвакатам у Вільні.

У акруговым судзе, які размяшчаўся ў палацы Тышкевіча на Троцкай вуліцы ў Вільні прысяжны паверaны выступаў абаронцам простых сярмяжнікаў і гарадской беднаты. Браўся Ф. Багушэвіч за самыя складаныя і нялёгкія судовыя справы, калі сялян абвінавачвалі ў “супраціўденні ўладам”, калі трэба было ўмела і з тактам абараняць сялян. Ф. Багушэвіч быў вядомы ў першую чаргу як мужыцкі адвакат.

Сяляне ішлі да яго не толькі таму, што ён ставіўся з павагай і спачувальна да іх патрэб, прымаў блізка да сэрца іх гора. Была і яшчэ адна і не менш важная прычына: Багушэвіч і сяляне з беларускіх вёсак размаўлялі на адной мове.

Арганічна ў Багушэвіча жыццё ўвайшлі навакольныя гарады і мястэчкі. Сярод іх – Ашмяны, Смаргонь, Жупраны. Тут не адзін раз ён бываў хлапчуком і падлеткам. Не мінаў ён іх і тады, калі працаваў у Вільні адвакатам. Былі тут у яго свае знаёмыя, прыяцелі. Паасобныя старонкі з жыцця і побыту Ашмян, Смаргоні, Жупран Ф. Багушэвіч апісаў у вершах, пісьмах і публіцыстычных нататках, што змяшчаліся ў часопісе “Край” пад назвамі “Лісты з правінцыі” і “Судовыя навіны”.

Паэтава хата. Яе дзверы заўседы былі адчынены для простага люду. Тут чалавек працы знаходзіў слова спагады, падтрымкі, ласкавы прыём. Неаднойчы Ф. Багушэвіч спраўляў у сваёй хаце вечарынкі для сялян, наймаў музыкаў, прасіў кушлянскіх дзяўчат і маладзіц спяваць песні.

У Кушлянах Ф. Багушэвіч працягвае літаратурную і навуковую дзейнасць. Піша вершы, апавяданні, працуе над слоўнікам беларускай мовы, збірае вусную народную творчасць.

Спачыў паэт 15 красавіка 1900 года. Пахаванне адбылося на могілках у Жупранах каля велічных муроў Жупранскага касцёла Пятра і Паўла. На магілу мясцовыя сяляне паклалі вянок з простай яліны, перавіты стужкамі.

Тут, ля касцёла, на магіле ў 1975 г. устаноўлена стэла з барэльефам паэта, якая была адноўлена ў 2011 годзе

У гонар Багушэвіча ў Жупранскім  касцёле ўстаноўлена памятная дошка з партрэтам паэта, а на Лысай гары ў Кушлянах на камяні, каля якога так любіў бываць паэт і пад які, паводле падання, хаваў свае вершы, быў выбіты надпіс «Памяці Мацея Бурачка. 1900».